# АГУЛЬНАДЗЯРЖАЎНАЕ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАЕ ЛЕТАПІСАННЕ

***«Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»*** (20-я гг. XVI ст.).

Новая патрыятычная і дзяржаўная канцэпцыя – ідэалагічная аснова стварэння другога агульнадзяржаўнага беларуска-літоўскага летапіснага звода. Легендарныя паданні пра патрыцыя Палямона, яго сыноў, заснаванне першых літоўскіх гарадоў і замкаў. Паэтычнае паданне пра заснаванне Вільні Гедымінам, звесткі пра абрады, звычаі і вераванні старажытных ліцвінаў, дзяржаўную сімволіку Вялікага княства Літоўскага. Псеўдагістарызм у перадачы асобных падзей, імкненне да ўзвелічэння Літвы і літоўцаў, прыніжэнне ролі русінаў у стварэнні і ўмацаванні Вялікага княства Літоўскага. Белетрызацыя падзей у 3-й рэдакцыі «Хронікі…» (сяр. XVI ст.), паказ інтымных бакоў жыцця вышэйшых асоб дзяржавы (Жыгімонт ІІ Аўгуст, Барбара Радзівіл).

***«Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму»*** (першая палова XVI ст.) у «Валынскім кароткім летапісе» – мастацкае адлюстраванне перамогі беларуска-літоўскага войска над маскоўскім у бітве пад Оршай 8 верасня 1514 г. Месца і час напісання летапіснага ўрыўка. Біблейска-хрысціянская і антычная топіка ў творы, сінтэз элементаў воінскай аповесці і традыцый урачыстага красамоўства. Вобраз гетмана Канстанціна Астрожскага ў галерэі вобразаў «ліцвінскіх Гектараў і Геркулесаў», створаных у эпоху Рэнесансу. «Пахвала... Астрожскаму» і «Пахвала... Вітаўту»: агульнае і адметнае.

***«Хроніка Быхаўца»*** (першая палова XVI ст.).

Складовыя часткі і гісторыка-літаратурныя крыніцы твора. Асаблівасці падачы падзей, звязаных з перасяленнем Палямона і яго прыбліжаных, блізкасць і адметнасць легендарнай часткі ў параўнанні з «Хронікай Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага». Асаблівасці паэтыкі хронікі, адыход ад штогадовых запісаў, мова помніка. Далейшае развіццё белетрызацыі ў апісанні падзей (жаніцьба Ягайлы з Соф’яй Гальшанскай). Ваенна-патрыятычная тэматыка (паход Альгерда на Маскву, Грунвальдская бітва і інш.). Міндоўг, Гедымін, Вітаўт, Ягайла ў ацэнцы летапісца. Ідэі літоўска-русінскай еднасці ў дзяржаве. Легендарнае і гістарычнае ў помніку. Адлюстраванне еўрапейскіх падзей у творы. Гісторыя знаходкі, апублікавання хронікі, яе пераклад на сучасную беларускую мову.